ПЕДАГОГ І ДАРАДЧЫК

ВІЦЕБСКАЙ АБЛАСНОЙ БІБЛІЯТЭЦЫ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА — 50 ГАДОЎ

У кастрычніку 1925 года па рашэнню Віцебскага выканаўчага камітэта ў Віцебску была пачата арганізацыя філіяла рэспубліканскай бібліятэкі. Асновай для гэтага паслужылі кніжныя фонды аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута, Інстытута народнай адукацыі, іншых дзяржаўных установ.

З правядзеннем у рэспубліцы абласнога падзелу (1938) бібліятэка была рэарганізавана ў абласную. Тады ж ёй было прысвоена імя У. І. Леніна.

Аб дзейнасці нашай бібліятэкі можна меркаваць па яе кніжнаму багаццю — 487 тысяч тамоў, якія размешчаны як на навуковых супрацоўнікаў і спецыялістаў, так і на масавага чытача.

Асаблівую ўвагу мы ўдзяляем якасці абслугоўвання наведвальнікаў, якое ажыццяўляецца праз спецыялізаваныя аддзелы і ў чытальнай зале.

Асобнае месца ў рабоце бібліятэкі адводзіцца вывучэнню наведвальнікамі твораў класікаў марксізму-ленінізму, Праграмы КПСС, рашэнняў XXIV з'езда КПСС, XXVII з'езда КПБ. Работнікі бібліятэкі не абмяжоўваюцца рэкамендацыяй кніг па абанементу, а выкарыстоўваюць разнастайныя формы наглядная і вуснай прапаганды — кніжныя выстаўкі, падборкі літаратуры, бібліяграфічныя агляды.


Вось некаторыя з іх — «У. І. Ленін і партыя», «У. І. Ленін аб камуністычным выхаванні», «У. І. Ленін аб моладзі», «Наш курс — камунізм», «Дабрабыт народа — вышэйшая мэта партыі», «Сусветная сістэма сацыялізму», «Эфектыўнасць вытворчасці: як яе павялічыць», «У дапамогу эканамічнаму і ўсеагульнаму навучанню», «У дапамогу тым, хто займаецца ў сістэме партыйнай асветы». Літаратуры, якая экспануецца на выстаўках і падборках, прысвячаюцца спецыяльныя гутаркі з чытачамі.

Дні інфармацыі, тэматычныя прагляды літаратуры, дні спецыялістаў, індывідуальная інфармацыя і іншыя формы работы, якія доўгі час былі прыдатнымі для спецыяльных бібліятэк, сёння сталі і ў нас пастаяннымі. Зусім нядаўна сумесна з Віцебскім аддзяленнем інстытута навуковай і тэхнічнай інфармацыі Дзяржплана БССР былі праведзены дні інфармацыі на тэмы «Стандарты і якасць», «НАП — важны фантар павышэння вытворчасці працы і эфектыўнасці вытворчасці», «Ахова працы і тэхніка бяспекі ў прамысловасці».

Цэнтрам нашай бібліятэкі з'яўляецца яе даведачна-бібліяграфічны аддзел, які штогод выдае больш як восем тысяч бібліяграфічных і фактычных даведак.

Пастановы ЦК КПСС «Аб стане і мерах паляпшэння бібліятэчнай справы ў краіне» (1959 г.) і «Аб павышэнні ролі бібліятэк у камуністычным выхаванні працоўных і навукова-тэхнічным прагрэсе» (1974 г.) патрабуюць ад нашых работнікаў большай творчай аддачы, выяўлення новых магчымасцей у павышэнні культуры кнігаабслугоўвання. За гэты час сетка бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры БССР у вобласці практычна падвоілася, кнігазабяспечанасць насельніцтва павялічылася ў 3,6 разоў, колькасць чытачоў — у 2,4 разы. Зараз у вобласці толькі бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры разнастайных тыпаў налічваецца 1104. Іх кніжны фонд складае 12 мільёнаў экземпляраў. Колькасць чытачоў у бібліятэках вобласці па адносінах да агульнага ліку жыхароў дасягнула 50 працэнтаў. Безумоўна, у станаўленні і развіцці бібліятэчнай справы ў вобласці вялікая роля належыць нашай абласной бібліятэцы, як буйнаму тэрытарыяльнаму навукова-метадычнаму цэнтру.

Нядаўняя пастанова ЦК КПСС



вызначыла магістральны на цяперашнім этапе шлях фарміравання новага аблічча масавай бібліятэкі — стварэнне цэнтралізаваных сістэм, здольных гранічна поўна задаволіць запатрабаванні савецкіх людзей на кнігу і інфармацыю. Ужо сёлета ў вобласці будуць дзейнічаць тры такія сістэмы — у г. Віцебску, Бешанковіцкім і Талачынскім раёнах.

Працалюбівы калектыў нашай бібліятэкі імкнецца да таго, каб своечасова трапіла да чытача кніга, дапамагла яму ў працы, вучобе, адпачынку. Мы і надалей будзем павышаць ролю бібліятэкі ў высакароднай справе выхавання актыўных, свядомых, усебакова развітых будаўнікоў камуністычнага грамадства.

У. ВАНЦЕЕУ,
дырэктар абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна,

А. ІВАНОЎ,
загадчык навукова-метадычным аддзелам.